Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 1. Варыянт 3. Ч.1**

**Заданне склаў: Барэйша Ілля Аляксандравіч, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА «Сярэдняя школа №5 г.Жлобіна»**

## Білет № 1

**Практычнае заданне. Станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**
Пытанні і заданні 1. Аб якім гістарычным працэсе ідзе гаворка?
2. Што такое суверэнітэт?
3. Якую ролю ў станаўленні дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь адыграла Белавежскае пагадненне?
4. Хто, паводле Канстытуцыі, абвяшчаўся носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай улады?

**І. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. 27 ліпеня 1990 г.**
«Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, выказваючы волю народа Беларускай ССР… урачыста абвяшчае поўны дзяржаўны суверэнітэт Беларускай ССР як вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады рэспублікі ў межах яе тэрыторыі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць рэспублікі ў знешніх адносінах дзяржавы.
Артыкул 1. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка – суверэнная дзяржава, якая зацвердзілася на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу…
Артыкул 2. Грамадзяне Беларускай ССР усіх нацыянальнасцей складаюць беларускі народ, які з'яўляецца носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады ў рэспубліцы…»

**ІІ. Падпісанне Белавежскага пагаднення, снежань 1991 г.**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**III. Структура вышэйшых органаў дзяржаўнай улады па Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са змяненнямі і дапаўненнямі)**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Адказы:**

**1.**Размова ідзе аб станаўленні дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

**2.**У дэкларацыі пазначана, што суверэнітэт - гэта поўная незалежнасць і самастойнасць улады ў межах сваёй дзяржавы, поўная незалежнасць рэспублікі ў знешняй палітыцы.

**3.**Працэс афармлення дзяржаўнага суверэнітэту - палітычнай незалежнасці і самастойнасці дзяржавы ва ўнутранай і знешняй палітыцы, якая не дапускае замежнага ўмяшання, - звязаны з прыняццем Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 27 ліпеня 1990г. У ёй БССР абвяшчалася суверэннай дзяржавай. Дата прыняцця гэтай Дэкларацыі з'яўлялася Днём Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Днём Рэспублікі) да рэферэндуму 1996г.

25 жніўня 1991г. быў прыняты Закон "Аб наданні статусу канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета БССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі". На наступны дзень, 26 жніўня, Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон "Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР". З гэтага часу прамое ўмяшанне саюзнай улады ў дзейнасць рэспублікі спынілася.

19 верасня 1991г. Вярхоўны Савет прыняў закон аб змяненні назвы Беларускай ССР на "Рэспубліка Беларусь", а ў скарочанай назве - Беларусь. З гэтага моманту найноўшай гісторыі Беларусі пачалося станаўленне суверэннай дзяржавы.

18 кастрычніка 1991г. быў прыняты Закон "Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь". Грамадзянства – прававая прыналежнасць асобы да дзяржавы – стала неад'емнай часткай дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі.

Паміж дзевяццю рэспублікамі СССР вяліся перамовы аб прыняцці новай Саюзнай дамовы. Ва ўмовах няўдалых спроб цэнтральнай улады распрацаваць новую Саюзную дамову, якая б захавала абноўлены СССР 8 снежня 1991г. у рэзідэнцыі Віскулі (Белавежская пушча) было падпісана "Пагадненні аб стварэнні Саюза Суверэнных Дзяржаў" (ССГ), пасля зменenae на "Пагадненні аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў" (СНД). Падпісана кіраўнікамі Расійскай Федэрацыі (Б.Н.Ельцын), Рэспублікі Беларусь (С.С.Шушкевіч) і Украіны (Л.М.Краўчук). Цэнтрам СНД была вызначана сталіца Беларусі горад Мінск.

Саюз ССР як суб'ект міжнароднага права і геапалітычная рэальнасць спыніў сваё існаванне». Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь 10 снежня 1991г. прыняў пастанову, якая скасавала Дагавор аб утварэнні СССР ад 30 снежня 1922г., і правёў ратыфікацыю (надаў юрыдычную сілу шляхам зацвярджэння) Пагаднення аб стварэнні СНД. У склад СНД увайшло 11 краін (былыя саюзныя рэспублікі, акрамя Грузіі і трох Прыбалтыйскіх рэспублік).

**4.** «Грамадзяне Рэспублікі Беларусь усіх нацыянальнасцяў складаюць беларускі народ, які з'яўляецца носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады, а дзяржава забяспечвае і абараняе правы чалавека. Народ выбірае кіраўніка дзяржавы, можа прыняць удзел ва Усебеларускіх народных сходах».

На рэспубліканскіх рэферэндумах 1995, 1996, 2004 і 2022 гг. вырашаліся важныя пытанні дзяржавы: аб унясенні змяненняў і прыняцці новай рэдакцыі Канстытуцыі, паўнамоцтвах прэзідэнта, сімволіцы Рэспублікі Беларусь, аб пераносе дня незалежнасці, аб узмацненні функцыі дзяржавы і ўзаемнай адказнасці дзяржавы і асобы, аб новых паўнамоцтвах Парламента і Усебеларускага народнага сходу.

Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**Дэма-версія практычнага задання для экзамена па гісторыі Беларусі, для навучэнцаў 9-х класаў (2022/2023 навучальны год). Білет 1. Варыянт 3. Ч.2**

**Заданне склаў: Барэйша Ілля Аляксандравіч, настаўнік гісторыі і грамадазнаўства ДУА «Сярэдняя школа №5 г.Жлобіна»**

## Білет № 1

## Практычнае заданне. Станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.

Другі магчымы варыянт

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні:**
Пытанні і заданні 1. Аб якім гістарычным працэсе ідзе гаворка ў дакуменце?
2. Як прапанаваны дакумент вызначае паняцце суверэнітэт?
3. Вызначыце, аб якім працэсе сведчыць дадзеная эмблема?
4. Хто, паводле Канстытуцыі, абвяшчаўся носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай улады?

**I. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР**
**27 ліпеня 1990 года**
«Вярхоўны Савет Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, выказваючы волю народа Беларускай ССР… урачыста абвяшчае поўны дзяржаўны суверэнітэт Беларускай ССР як вяршэнства, самастойнасць і паўнату дзяржаўнай улады рэспублікі ў межах яе тэрыторыі, правамоцнасць яе законаў, незалежнасць рэспублікі ў знешніх адносінах дзяржавы.
Артыкул 1. Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка – суверэнная дзяржава, якая зацвердзілася на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емнага права на самавызначэнне, дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу…
Артыкул 2. Грамадзяне Беларускай ССР усіх нацыянальнасцей складаюць беларускі народ, які з'яўляецца носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады ў рэспубліцы…»

**II.Сімвалы Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД)**



Крыніца: adu.by Нацыянальны інстытут развіцця адукацыі

**III. Структура вышэйшых органаў дзяржаўнай улады па Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са зьмяненнямі і дапаўненнямі)**




## Адказы на заданні і каментарыі

| № | Адказ | каментар |
|---|---|---|
| 1. | Размова ідзе аб станаўленні дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. | Заданне правярае ўменні:<br>1) праводзіць аналіз дакумента<br>2) знаходзіць і здабываць неабходную інфармацыю. |
| 2. | У дэкларацыі пазначана, што суверэнітэт - гэта поўная незалежнасць і самастойнасць улады ў межах сваёй дзяржавы, поўная незалежнасць рэспублікі ў знешняй палітыцы. | Заданне правярае ўменні:<br>1) праводзіць аналіз дакумента<br>2) знаходзіць і здабываць інфармацыю. |
| 3. | Ва ўмовах няўдалых спроб цэнтральнай улады распрацаваць новую Саюзную дамову, якая б захавала абноўлены СССР 8 снежня 1991г. у рэзідэнцыі Віскулі (Белавежская | Заданне правярае ўменні:<br>1) праводзіць аналіз ілюстрацыйнага матэрыялу |

| | | |
|---|---|---|
| | пушча) было падпісана"Пагадненні аб стварэнні Саюза Суверэнных Дзяржаў" (ССГ), пасля зменена на "Пагадненні аб стварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў" (СНД).Падпісана кіраўнікамі Расійскай Федэрацыі (Б.Н.Ельцын),Рэспублікі Беларусь(С.С.Шушкевіч)іУкраіны(Л.М.Краўчук). Цэнтрам СНД была вызначана сталіца Беларусі горад Мінск.<br>Канстатавалася, што СССР спыняў сваё існаванне як суб'ект міжнароднага права і палітычнай рэальнасці. Аднак, грунтуючыся на гістарычнай агульнасці народаў, сувязях паміж імі, улічваючы двухбаковыя дагаворы, імкненне да дэмакратычнай прававой дзяржавы, намер развіваць свае адносіны на аснове ўзаемнага прызнання і павагі дзяржаўнага суверэнітэту, бакі дамовіліся ў канчатковым варыянце аб утварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў.<br>У склад СНД увайшло 11 краін (былыя саюзныя рэспублікі, акрамя Грузіі і трох Прыбалтыйскіх рэспублік).<br>Першыя гады існавання арганізацыі ў большай ступені былі прысвечаны арганізацыйным пытанням. Арганізацыйны этап завяршыўся 22 студзеня 1993 г., калі ў Менску быў прынятыСтатут Садружнасці Незалежных Дзяржаў, асноўны дакумент арганізацыі.<br>18-19 студзеня 1996г. рашэннем Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД было зацверджана палажэнне аб эмблеме і флагу СНД. | 2) выкарыстоўваючы раней вывучаны матэрыял, даваць разгорнуты адказ на пастаўленае пытанне |
| 4. | «Грамадзяне Рэспублікі Беларусь усіх нацыянальнасцяў складаюць беларускі народ, які з'яўляецца носьбітам суверэнітэту і адзінай крыніцай дзяржаўнай улады, а дзяржава забяспечвае і абараняе правы чалавека. Народ выбірае кіраўніка дзяржавы, можа прыняць удзел ва Усебеларускіх народных сходах».<br>На рэспубліканскіх рэферэндумах 1995, 1996, 2004 і 2022 гадоў вырашаліся важныя пытанні дзяржавы: аб унясенні зьмяненняў і прыняцці новай рэдакцыі Канстытуцыі, паўнамоцтвах прэзідэнта, сімволіцы | Заданне правярае ўменні:<br>1) працаваць са схемамі, здабываць з іх неабходную для адказу інфармацыю |

| | | |
|---|---|---|
| | Рэспублікі Беларусь, аб пераносе дня незалежнасці, аб узмацненні функцыі дзяржавы і ўзаемнай адказнасці дзяржавы і асобы, аб новых паўнамоцтвах Парламента і Усебеларускага народнага сходу. | |